*Юлія Пярсідская*

# ШЛЯХІ РАЗВІЦЦЯ НАЦЫЯНАЛЬНАГА МАСТАЦТВА: ХАРАКТАР МАСТАЦКІХ ЗБОРАЎ ГАРАДЖАН БЕЛАРУСІ Ў XVI - XVII СТСТ.

Айчыннае мастацтвазнаўства ў апошні час стала на шлях актыўнага засваення розных сфер духоўнай спадчыны Беларусі, яе вывучэнне і захаванне з'яўляецца асноўнай мэтай навуковага свету. Помнікі архітэктуры, жывапісу, літаратуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва змяшчаюць у сябе вялікую колькасць каштоўных звестак аб палітычным, эканамічным, сацыяльным і культурным жыцці старажытнага грамадства, дапамагаюць вылучыць і прааналізаваць шляхі развіцця беларускага мастацтва, характар яго ўзаемадзеяння з культурамі краін Заходняй і Усходняй Еўропы.

Дэкаратыўна-прыкладное і выяўленчае мастацтва развівалася ў межах мастацкага жыцця тагачаснага грамадства. На працягу ўсяго перыяду XVI - XVII стст. гараджане фарміруюць асабістыя зборы, у якія ўваходзілі каштоўнасці і прадметы жывапіснага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Са старажытных часоў сярод усіх слаёў грамадства было распаўсюджана калекцыяніраванне дэкаратыўна- прыкладных рэчаў - кубкаў, келіхаў, чашаў, пацір, некаторыя з якіх з'яўляліся сапраўднымі прадметамі мастацтва: сустракаліся келіхі срэбраныя, пазалочаныя, крышталёвыя, у золата апраўленыя, розных формаў. Нярэдка кубкі былі зроблены ў форме заморскіх жывёл і птушак, а таксама міфалагічных выяў. З архіўных крыніц вядома, што падчас польскага пасольства ў Маскву (1600 г.) сыну цара Барыса падаравалі кубак у выглядзе «птушкі страуса жамчужнага срэбнага, золатам апраўленага з каменнямі» [15, с. 21], а ***Ян*** Мікалаевіч Сапега (сын канцлера Льва Сапегі, ваявода Віцебскі) асабіста падараваў цару Барысу Фёдаравічу кубак срэбны ў вобразе Купідона, альбо «...чалавека з крыламі і лукам» [15, с. 22]. У XVI ст. калекцыяніраванне каштоўных рэчаў шырока распаўсюдзілася. Так, у калекцыі, пакінутай пасля смерці Януша Радзівіла, маецца сапраўдны твор мастацтва - чаша з фігурай ільва - «...чара запацістая, леў на ёй» [8, с. 423].

Увогуле, менавіта калекцыяніраванне кубкаў у гэты перыяд мела асаблівае значэнне ў мастацкім упрыгожванні жыцця прадстаўнікоў усіх саслоўных груп. Нярэдка кубкі прыносілі ў падарунак, узнімалі за здароўе ганаровага госця, а потым бераглі, як вялікую каштоўнасць. Напрыклад, Іван Сапега, ваявода Падляскі, калі прымаў у сваёй рэзідэнцыі караля Жыгімонта І, паднімаў за яго здароўе шкляны келіх. Распачуты манарх у знак падзякі надаў келіху імя гаспадара - «Іван». Незвычайную рэліквію старанна берагліі, і ў 1643г. той жа келіх «Іван» паднімаў за здароўе манарха Уладзіслава IV праўнук Сапегі - Казімір. Кароль вырашыў надаць «Івану» асабісты прывілей: келіх павінен быў захоўвацца ў камодзе і выкарыстоўвацца толькі падчас урачыстасцей пры гуках вясёлай музыкі і гарматных стрэлах [4]. Калі ж у 1617 г. гараджане Нясвіжа сустракалі каралевіча Уладзіслава, а ў працэсіі ўдзельнічала харугва Радзівіла, гарадскія цэхі пачалі «...піць заздраўны кубак за здароўе яго каралеўскай Вялікасці», з нагоды чаго раздаўся моцны выбух гарадскіх гармат [6, с. 58].

Кубкі, што сустракаюцца ў інвентарных вопісах заможнай шляхты, магнатаў, а таксама духавенства, часцей за ўсё былі срэбраныя ці пазалочаныя, рэльефныя, з накладнымі чаканнымі выявамі. Калі кубак прызначаўся ў падарунак свецкай асобе, унізе ставілі дароўны надпіс ці чаканілі радавы герб той асобы, што кубак урачыста падносіла. Акрамя дароўных надпісаў на пацiры наносілі цэлыя павучальныя выразы: «зри, смотри, и люби и не проси» ці «не злись, смирись, человече, желаешь славы земныя, зато не наследишь небесныя» [5, с. 160].

Кубкі завяшчалі не толькі сваім родным, а нават і знаёмым у знак асабістай падзякі. Так. пан Андрэй Морштын пакідаў «прыяцелем сваім» кубкі з апісаннем іх выгляду: «...два кубки позлотистые з коралевыми рогами...» [13, с. 93].

Вялікія зборы прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і рэлігійных каштоўнасцей існавалі ў сценах храмаў і цэркваў гарадоў. Так, у Віцебскім летапісу ад 1629 г. ёсць запіс, дзе апісваецца пажар Саборнай царквы, падчас якога загінула незлічоная колькасць сабранага скарбу: золата, срэбра, жэмчугу і іншых каштоўнасцей, што дае магчымасць ўявіць і характар мастацкіх збораў у сакральных будовах [3].

Духавенства прымала ў падарунак прынашэнні прыхаджан, сярод якіх сустракаліся і творы мастацтва - пазлачоныя і срэбныя кубкі з даравальнымі надпісамі, распяцці з золата, іконы, упрыгожаныя каштоўнымі каменнямі, і інш. Мяшчане і шляхта не толькі даравалі пацiры цэрквам падчас рэлігійных свят, але і завяшчалі іх. Так, у духоўных тэстамэнтах мяшчан сустракаюцца і ўпамінанні аб тым, што кубак (звычайна срэбны, пазлачоны) родныя пасля смерці павінны перадаць царкве [1].

Змест выяў на чашах, падараваных царкве, быў разнастайны і залежыў ад таго. каму чаша была прызначана ў падарунак: у царкоўным інвентары сустракаліся кубкі з фігурамі херувімаў. апосталаў і разнастайных сцэн з Бібліі. Так, у інвентарным вопісе 1887 г. Мінскага гарадскога Екацярыненскага сабора (заснаванага ў 1611 г.), што знаходзіцца ў аддзеле старадрукаў НББ, згадваюцца апісанні пацір, што меліся ў храме, якія ахвяравалі царкве прыхаджане ў 1637 г.: пацір срэбны, пазлачоны, «...вытанчанай рэльефнай работы ў стылі Рэнесанс,...вакол чашы вычаканены распяцце, Тайная Вячэра і Сашэсце Святого Духа на Апосталаў; на паддонніку - Святыя Апосталы: Пётр, Павел, Іаан Багаслоў, Іакаў, Варфаламей і Матфей...» [14, с. 14].

На паддонніках чашаў знаходзіліся надпісы, у змесце якіх значылася, да якога рэлігійнага свята келіх ці паціра (чаша) былі заказаны і падараваны: «Сей келіх ёсць наданы ад мяне Сяргея Барысавіча і дзяцей маіх да Царквы Раства Прысвятое Багародзіцы року 1637» [14, с. 13].

Акрамя ікон у пасярэбраных і залацістых акладах, у каталіцкіх і уніяцкіх храмах распаўсюдзіліся «італьянскія іконы» на палатне. Так, Пётр Магіла выказваў свайму праціўніку Кассіяну (уніяту) незадавальненне наконт таго, што ў храмах «замест злачонага срэбра цяпер фарбаванае палатно» [7, с. 74]. Нярэдка іконы спецыяльна прывозілі ў дар знатным асобам, якія, у сваю чаргу, ахвяравалі іх царкве. У 1683 г. Дунілавіцкаму касцёлу Альжбэтай Белазор быў падараваны абраз Божай Маці Ларэтанскай, што прывёз ёй з Фларэнцыі віленскі епіскап Мікалай Кац [2]. Дадзеныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

факты сведчаць аб непазбежнай секулярызацыі напрыканцы XVII ст. мастацкага жыцця ўсіх саслоўяў, паколькі іконы ў тэты час з'яўляюцца не толькі сакральным сімвалам, але ўжо і творам мастацтва.

Са звестак, сабраных у археалагічным зборніку дакументаў за 1572 - 1701 гг., сярод дзяржаўных прывілеяў і спраў можна знайсці запісы, якія характарызуюць мастацкія зборы і гараджан, і цэркваў у гарадах Беларусі. У скарбніцы богаўгодных месцаў гарадоў прыносілі нават зброю: у інвентары Троіцкай царквы зазначалася, што «Скумін Тышкевіч падараваў сваю шаблю багата ўпрыгожаную золатам і каштоўнымі каменнямі» [11, с. 44]. Заможныя гараджане ахвяравалі і ювелірныя вырабы. Так, мяшчанка Усціна Касцюковічава ў 1665 г. падаравала 27 каралаў з крыжыкамі срэбнымі да абраза святой Панны Марыі [10]. Васілій Хлявінскі, які калісьці з'яўляўся дэпутатам трыбуналу, у 1677 г. паднёс да іконы Маці Боскай у Віленскім Свята-Троіцкім манастыры некалькі пярсцёнкаў [11].

Таксама з XVI ст. у мастацкія зборы прывілегіраванага саслоўя, заможных гараджан пачынаюць трапляць прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, выкананыя з каштоўных металаў і каменняў. Так, пан Андрэй Морштын, згаданы вышэй, завяшчаў сваім прыяцелям пазалочаную фігурку каня, «...который есть позлочоный накъшалътъ кубковый» [13, с. 93].

У інвентарным вопісе, што застаўся пасля смерці Януша Радзівіла, указаны дзве пазалачоныя фігуркі «адзінарожца» і статуэтка «магаметанкі ў скрыне доўгай» [8, с. 426]. Акрамя вышэйназваных фігур у калекцыях гараджан сустракаліся прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, зробленыя ў выглядзе кветак. У войта магілёўскага Пятра Казановіча была «ружа залатая, рубінамі пакрыта» [12, с. 370]. Сярод іншых рэчаў назавем пазалачоныя лейкі з рознымі выгрывіраванымі выявамі - у Януша Радзівіла была вялікая лейка з намаляванай на ёй «перамогай князя яго міласці» [8, с. 432]. Магнатэрыя ў сваіх гарадах і мястэчках мела вялікія зборы, якія складаліся з шматлікіх каштоўных прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва - пярсцёнкаў, запінкаў, завушніц, каштоўных каменняў.

Уласна-побытавыя мастацкія прыярытэты гараджан ўзбагачаліся і кніжнымі зборамі. Цікава, што пры інвентарным перапісу маёмасці звычайна апісвалі памеры і колькасць кніг: «кніг вялікіх - 15, ...in octavo - 24» [12, с. 375]. Зрэдку ўказвалі тэматычны змест кнігі: «...кніжкі розныя папяровыя малыя, такія, як гісторыя, дыдактыка і т.д.» [12, с. 375]. Асабліва адзначалі кнігі рэлігійнага зместу. Дарэчы, у бібліятэцы нават простых гараджан мелася па некалькі выданняў кніг «друку Скоринина» [9, с. 242]. Брэсцкі мяшчанін Гурын Фёдаравіч завяшчаў сваім нашчадкам і розным цэрквам Брэста Евангелле, Актоіх, Апостал (дзве кнігі друку Скарыны), Псалтыр і г.д.

Такім чынам можна адзначыць, што нязменнымі рэчамі ў зборах на працягу ўсяго перыяду з'яўляліся келіхі і чашы з каштоўных металаў, ювелірныя ўпрыгожванні, выявы святых (іконы, апраўленыя ў срэбра), рукапісныя, а потым і друкаваныя кнігі, з канца XVI ст. назіраецца цяга да збірання прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва - фігур міфалагічных персанажаў, жывёл і раслін. Выяўленчае мастацтва паступова страчвала культавае прызначэнне: разам з іконамі сцены гарадскіх дамоў пачалі ўпрыгожваць карціны і габелены, выкананыя на свецкія сюжэты. Страчвае асабіста сакральны сімвал і ікона - магнатэрыя, заможныя гараджане і нават духавенства імкнуцца здабыць модныя ў той час італьянскія іконы, фарбаваныя на палатне.

**Спіс літаратуры:**


1. Асветнікі зямлі Беларускай: энцыкл. давед. / рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]. - Мінск: БелЭН, 2001. - 496 с.: іл.
2. Беларусы : у 8 т. / В.Ф. Бацяеў [і інш.] ; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. - Мінск: Бел. навука, 1999 - 2004. - Т.6 : Грамадскія традыцыі. - 2002. - 606 с. : іл.
3. Віцебскі летапіс [Электронны рэсурс] // Беларускія летапісы і кронікі. Менск, МФ «Беларускі кнігазбор». - 1997. - Рэжым доступу: http://www.bk.knihi.com. - Дата доступу : 02.05.2006.
4. Казімер Леў Сапега / пер. : Ц. Трызны // [Электронны рэсурс]. - Рэжым доступу : http: // brama.brest.by/nomer2/artic05.shtml. - Дата доступу : 06.11.2006.
5. Костомаров, Н.И. Очерк домашней жизни и нравов великорусского народа в XVI и XVII столетиях / Н.И. Костомаров; авт. очерка и коммент. Б.Г. Литвак. - М.: Республика, 1992. - 303 с.
6. Котлярчук, А.С. Праздничная культура в городах России и Белоруссии XVII века: официальные церемонии и крестьянская обрядность / А.С. Котлярчук. - СПб.: Петербургское Востоковедение, 2001. - 240 с.
7. Крачковский, Ю.Ф. Очерки униатской церкви / Ю.Ф. Крачковский. - Б.м.: Б.и., Б.г. - 282 с.
8. Kotlubaj, E. Zycie Janusza RadziwiHa / E. Kotlubaj. - Wilno, Witebsk: Nakladem Mindelsohna Ksi<?garza, 1859.-458 s.
9. Акты, издаваемые Виленскою археографическою комиссиею. Т. XIV.: Инвентари имений XVI столетия. - Вильна: Типография А.Г. Сыркина, 1887. - 703 с.
10. Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией.-СПб., Б.и., 1853. -Т.5: 1633 - 1699. - VII, 288, [28] с.
11. Археологический сборник документов, относящийся к истории Северо-Западной Руси, издаваемый при управления Виленского учебного округа. Т.10: [Документы 1572 - 1701 гг.]. - Вильна: Печатано в Типографии О.Блюмовича, 1874. - VIII, 392 с.
12. Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской, хранящиеся в центральном архиве в Витебске и изданные под редакцией архивариуса сего архива Созонова. Вып. 10.-Витебск: В Типографии Губернского Правления, 1879.-544с.
13. Метрыка Вялікага Княства Літоўскага: кн. 43 (1523-1560) / падрыхт. В.С.Мянжынскі; НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. - Мінск: Бел. навука, 2003. - 167 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

14. Метрика для получения верных сведений о древнеправославных храмах Божиих, зданиях и художественных предметах: [Минский градский Екатерининский собор]. - Минск: Б.и., 1887. - 30 с.
15. Poselstwo Lwa Sapiehy w roku 1600 do Moskwy, podlug dyaryusza Eljosza Pielgrzymowskiego sekretarza poselstwa / opisane z r?kopisu przaz W. Tr^bickiego. - Grodno: W Drukarni Rzqdowej, 1846. - 43 s.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ